Голас Радзімы

№ 27 (1493)
7 ліпеня 1977 г.

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ
(БЕЛАРУСКАЕ ТАВАРЫСТВА «РАДЗІМА»)

Год выдання 22-і
Цана 2 кап.



Традыцыйнае і сучаснае... Гэтыя словы мы часта ўжываем, расказваючы пра Беларусь. Традыцыйны пейзаж і новабудоўлі, ільняныя абрусы і электронныя машыны... Фотакарэспандэнт Юрый ІВАНОЎ паспрабаваў параўнаць волатаў—сучасных і колішніх.

У МІНСКУ БУДЗЕ МЕТРО

АБГРУНТОЎВАЮЧЫ неабходнасць будаўніцтва ў сталіцы Расійскай імперыі метрапалітэна, рускі інжынер Балінскі ў 1902 годзе пісаў ва ўступнай частцы да свайго праекта: «Вялікія розумы таго стагоддзя напалі на шчаслівую думку дарог вялікай хуткасці... Усе гарады з насельніцтвам звыш мільёна ўжо маюць дарогі вялікай хуткасці, за выключэннем Пецярбурга, Масквы і пяці кітайскіх гарадоў».

Не ведаем як наконт «пяці кітайскіх гарадоў», у Маскве ж і Ленінградзе метро, створанае рукамі савецкіх людзей, перавезла за гады свайго існавання мільярды пасажыраў. У пасляваенныя гады метрапалітэны былі ўведзены яшчэ ў пяці гарадах Савецкага Саюза. Цяпер пачынаецца будаўніцтва першай чаргі метро ў Мінску.

Калі нашы суайчыннікі з розных краін прыязджаюць у Мінск, іх знаёмства са сталіцай Беларусі пачынаецца з экскурсіі па гораду. І гід, знаёмячы гасцей з гісторыяй горада, раскажа, што ў 1892 годзе ў Мінску ўступіла ў строй конка — правобраз сучаснага трамвая. А ў 1924 годзе з'явіліся першыя аўтобусныя маршруты. Запомніць турыст і такую лічбу: праз паўгода пасля вызвалення ад фашысцкіх захопнікаў мінчане карысталіся паслугамі ўсяго толькі 21 аўтобуса.

Сёння можна хутка дабрацца ў любы куток нашага горада на трамваі, тралейбусе або аўтобусе. Але ж нельга бясконца павялічваць іх лік: гэта азначала б запрудзіць вуліцы і пазбавіць транспарт самай галоўнай перавагі — хуткасці. А ўжо сёння па Ленінскаму праспекту на ўчастку ад плошчы Леніна да Цэнтральнай праходзяць 5 аўтобусных і 5 тралейбусных маршрутаў з сумарнай інтэнсіўнасцю каля 220 машын у гадзіну «пік». Колькасць жа пасажыраў пастаянна павялічваецца — насельніцтва горада пераваліла ўжо за мільён. Вось чаму загадзя, яшчэ да таго як асноўныя транспартныя магістралі горада поўнасцю вычарпаюць сваю прапускную здольнасць, было вырашана будаваць у Мінску метро.

ПА ГОРАДУ закрочылі буравыя вышкі, якія бяруць пробы грунту на месцы будучай падземнай дарогі, складаўся геалагічны разрэз трасы, затым трасіроўшчыкі ўстанаўлівалі, на якіх глыбінях могуць размяшчацца лініі метро... Быў распрацаваны тэхнічны праект участка першай лініі Мінскага метрапалітэна. На ёй запраектавана восем станцый:

[Заканчэнне на 2-й стар.]

нататкі каментатара

УЛАДА НАРОДНАЯ

Прэзідыум Вярхоўнага Савета Беларускай ССР апублікаваў паведамленне аб выніках выбараў у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Саветы дэпутатаў працоўных рэспублікі, якія адбыліся 19 чэрвеня 1977 года. Аб чым сведчаць гэтыя вынікі?

Яны наглядна паказваюць, што выбары з'явіліся сведчаннем трыумфу сацыялістычнай дэмакратыі, новым доказам жыццёвай сілы нашага савецкага ладу жыцця.

Праявілася гэта перш за ўсё ў высокай палітычнай актыўнасці выбаршчыкаў. Згодна з палажэннем, выбары праходзілі з 6 гадзін раніцы да 10 гадзін вечара. Але падача галасоў практычна закончылася задоўга да канца ўстаноўленага тэрміну. У нас стала ўжо традыцыяй—дружна і арганізавана з'яўляцца на выбарчыя ўчасткі, каб выканаць свой грамадзянскі абавязак. Вось і на гэты раз у галасаванні па рэспубліцы прынялі ўдзел 6 мільёнаў 296 тысяч 961 чалавек, або 99,99 працэнта ад агульнага ліку грамадзян, унесеных у спісы выбаршчыкаў.

Яшчэ адна характэрная дэталь: ніводзін кандыдат у дэпутаты не быў забалаціраваны. Гэта таксама вельмі знамянальна. Вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты ў нас, як вядома, праходзіць на агульных сходах працоўных з самым дэталёвым абмеркаваннем кожнай кандыдатуры. У якасці сваіх пасланцоў у органы дзяржаўнай улады калектывы звычайна называюць імёны самых лепшых людзей, чым і тлумачыцца актыўнае галасаванне за кандыдатаў блоку камуністаў і беспартыйных.

Яшчэ адзін паказальны статыстычны падлік. На цяперашніх выбарах дэпутатам мясцовых Саветаў стаў кожны васьмідзесяты дарослы грамадзянін нашай рэспублікі. А калі ўлічыць яшчэ тое, што і цяпер гэтыя самыя масавыя органы дзяржаўнай улады абнавіліся амаль на палавіну, то стане ясна: насельніцтву ў іх прадстаўлены самыя шырокія паўнамоцтвы. У мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных абраны людзі, якія заслужылі давер выбаршчыкаў сваёй актыўнай грамадскай дзейнасцю, выдатнымі працоўнымі поспехамі і асабістым прыкладам у жыцці. Калі мы паглядзім састаў любога Савета, то ўбачым, што яго дэпутатамі з'яўляюцца прадстаўнікі ўсіх слаёў савецкага грамадства. Цяпер у мясцовыя органы дзяржаўнай улады ў нас на Беларусі выбрана 79 тысяч 815 дэпутатаў, сярод якіх рабочыя і сяляне складаюць амаль 68 працэнтаў. Астатнія дэпутаты—прадстаўнікі народнай інтэлігенцыі: настаўнікі, урачы, аграномы, інжынеры, юрысты, партыйныя, савецкія, прафсаюзныя работнікі. 56,5 працэнта дэпутатаў — беспартыйныя, 47,9 працэнта—жанчыны, дэпутатаў ва ўзросце да 30 гадоў—30,8 працэнта.

Мясцовы Савет дэпутатаў працоўных з'яўляецца паўнапраўным гаспадаром на сваёй тэрыторыі. Ён мае свой бюджэт, сочыць за яго даходамі і выдаткамі. Непасрэдна Савету падпарадкаваны прадпрыемствы мясцовай прамысловасці. Ён будуе на дзяржаўныя сродкі жылыя дамы для насельніцтва і размяркоўвае кватэры, узводзіць школы, бальніцы, кінатэатры, займаецца добраўпарадкаваннем паселішчаў, праз свае адпаведныя аддзелы кіруе народнай асветай і аховай здароўя, работай прадпрыемстваў гандлю і камунальнай гаспадаркі, арганізуе ахову грамадскага парадку, выплачвае дзяржаўныя пенсіі састарэлым і інвалідам. Карацей кажучы, у веданні мясцовага Савета знаходзіцца ўся эканамічная і сацыяльна-культурная дзейнасць горада, вёскі, пасёлка, раёна, вобласці.

Трэба адзначыць, што за апошні час правы мясцовых Саветаў значна расшыраны. Гэта—вынік палітыкі Камуністычнай партыі, накіраванай на далейшае ўдасканаленне сацыялістычнай дэмакратыі. Напрыклад, Саветы сталі ўдзельнічаць у складанні планаў прадпрыемстваў рэспубліканскага і саюзнага падпарадкавання, якія знаходзяцца на іх тэрыторыі.

Значна ўмацаваў грамадска-прававое становішча народных абраннікаў Закон аб статусе дэпутатаў. Зараз гэта знаходзіць сваё грамадска-прававое замацаванне ў праекце новай Канстытуцыі СССР, які вынесены на ўсенароднае абмеркаванне. Дэпутат мае права запыту да адпаведных дзяржаўных органаў і службовых асоб, якія абавязаны даць тлумачэнні на сесіі Савета. Дэпутат можа звяртацца ва ўсе дзяржаўныя і грамадскія арганізацыі, прадпрыемствы, установы па пытаннях сваёй дэпутацкай дзейнасці і ўдзельнічаць у разглядзе ўзнятых ім пытанняў.

Савецкі дэпутат непарыўна звязаны з народам, ён у адказе перад выбаршчыкамі і падсправаздачны ім. Гэта адзін з канстытуцыйных прынцыпаў савецкіх прадстаўнічых органаў, пераканаўчае сведчанне паслядоўнага і глыбокага дэмакратызму нашага ладу. Ленінскі прынцып справаздачнасці дэпутатаў перад выбаршчыкамі замацоўваецца і ў праекце новай Канстытуцыі СССР. Дэпутацкія справаздачы развіваюць інтарэс у працоўных да дзяржаўнага кіравання, стымулююць палітычную актыўнасць мас, забяспечваюць эфектыўны кантроль народа над дзейнасцю Саветаў і іх органаў.

Пётр СУДАКОЎ.

У МІНСКУ БУДЗЕ МЕТРО

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Маскоўская», «Плошча імя У. І. Леніна», «Цэнтральная плошча», «Плошча Перамогі», «Плошча Я. Коласа», «Акадэмічная», «Парк Чалюскінцаў» і «Валгаградская». Давайце, чытач, мысленна «пройдзем» па маршруту першай лініі метро. Нашым «гідам» будзе Юрый Каламіец, які выконвае абавязкі начальніка будаўніцтва метрапалітэна:

— Працягласць першага адрэзка — 8,6 кіламетра. Як бачыце, сярэдняя адлегласць паміж станцыямі — 1,12 кіламетра. Ад станцыі «Маскоўская» траса пройдзе ў кірунку чыгуначнага вакзала. Затым — паўз Беларускі дзяржаўны універсітэт, перасячэ плошчу Леніна і ўздоўж Ленінскага праспекта дасягне станцыі «Валгаградская». Станцыі метрапалітэна ахопліваюць, як гавораць спецыялісты, асноўныя пасажыраўтваральныя пункты цэнтральнай часткі Мінска.

Якія ж гэта пункты?

Станцыя «Маскоўская» размесціцца непадалёк ад грузавых пуцей Беларускай чыгункі па вуліцы Маскоўскай. У квартале паміж вакзальнай плошчай і плошчай імя Леніна будзе другая станцыя. Астатнія размесцяцца ўздоўж Ленінскага праспекта — найбольш загружанай сёння магістралі горада. «Цэнтральная плошча»— на аднайменнай плошчы, «Плошча Перамогі» паміж плошчай Перамогі і вуліцай Казлова, «Плошча Якуба Коласа» — на плошчы той жа назвы, станцыя «Акадэмічная» — паміж аднайменнай вуліцай і Друкарскай, «Парк Чалюскінцаў» — ля парка з такой жа назвай, станцыя «Валгаградская» — у раёне комплексу будынкаў кінастудыі Белаўсьфільм. У першы перыяд эксплуатацыі прадугледжана выкарыстанне 24 пар чатырохвагонных цягнікоў, якія будуць рухацца (з улікам стаянак) з хуткасцю 41,7 кіламетра ў гадзіну і адлегласць паміж канцавымі станцыямі пройдуць за 11,3 мінуты.

Мы таму так падрабязна расказваем аб маршруце, аб руху цягнікоў, бо ўпэўнены— многія з вас, дарагія чытачы, выкарыстаюць паслугі Мінскага метро: першая чарга яго ўступіць у строй ужо ў будучай пяцігодцы.

За першым участкам метро будуць і іншыя. Сістэма ліній метрапалітэна, распрацаваная на перспектыву да 1990 года, прадугледжвае будаўніцтва яшчэ двух дыяметраў: паўночны захад—паўднёвы ўсход і поўдзень—поўнач.

З УСІХ збудаванняў метрапалітэна, на думку спецыялістаў, станцыі з'яўляюцца асноўнымі як па аб'ёму работ, так і па складанасці будаўніцтва. На станцыях павінны быць зручныя вестыбюлі, касавыя залы, уваходы на эскалатары і выхады з іх. Платформы павінны быць шырокімі, з добрым асвятленнем і чыстым паветрам. Праўда, такія патрабаванні да метро прад'яўляюцца не ўсюды. Вось што, напрыклад, піша аб нью-йоркскім сабвеі журналіст Барыс Стрэльнікаў: «...падземных станцый-вестыбюлей у тутэйшым метро амаль няма. Проста ля тратуара літаральна «дзірка ў зямлі» і запляваная, засмечаная чыгунная лесвіца, якая вядзе ўніз, да кас і турнікетаў. Эскалатараў таксама няма: метро неглыбокае, яшчэ на тратуары адчуваеш, як пад нагамі дрыжыць зямля, чуеш грукат цягнікоў, што праносяцца ўнізе».

— Упэўнены, што Мінскае метро будзе выгадна адрозніваць ад амерыканскага, як, дарэчы, адрозніваюцца і ўсе ўжо існуючыя метрапалітэны ў нашай краіне, — гаворыць Ю. Каламіец. — Хоць сякія-такія тэхнічныя праблемы ў нас падобны. Складаныя інжынерна-тэхнічныя ўмовы (блізкасць грунтовых вод, асадкавыя пароды грунтоў) на трасах будаўніцтва не дазваляюць нам зрабіць метро глыбокім. З аднаго боку—гэта добра: транспарт будзе зручным для пасажыраў. А для нас—гэта дадатковыя складанасці: трэба зрабіць так, каб метрапалітэн не перашкаджаў сваім шумам і вібрацыяй. І з гэтай праблемай мы справімся, як, дарэчы, і з іншымі.

...Лінія метро пройдзе недалёка ад гістарычнага Дома і з'езда РСДРП, які размешчаны над ракой Свіслач. Разглядаўся эстакадны варыянт перакрыжавання гэтага месца. Затым ад яго адмовіліся. Каб не парушыць архітэктурны ансамбль, што ўжо склаўся, ядром якога з'яўляецца плошча Перамогі з абеліскам і Вечным агнём, было вырашана ажыццявіць тунельнае перасячэнне ракі. Але высветлілася, што нельга кранаць ваданосныя пласты — гэта адбілася б на колькасці і якасці выдатнай пітной вады Мінска. Метад замарожвання грунтоў—занадта працаёмкі. І мінскія спецыялісты знайшлі арыгінальнае выйсце: воды Свіслачы на ўчастку выгібу ракі ля сквера імя Янкі Купалы і парка імя Горкага часова пойдуць па рэчышчу дажджавога калектара, а калі метрабудаўнікі пяройдуць адкрытым спосабам водны рубеж, рака зноў вернецца ў сваё ложа.

— Адкрытым спосабам будуць будавацца і станцыі першай лініі,—працягвае свой расказ Ю. Каламіец. — У чым ён заключаецца? Капаецца катлаван, па дну якога пускаюць тонкі, «падсцілаючы» слой бетону, на яго кладуць некалькі слаёў воданепранікальнага матэрыялу, затым «сцяжку»... Наогул, робіцца ўсё, каб станцыі (большасць з іх збіраецца з уніфікаваных жалезабетонных блокаў) вытрымалі б на працягу доўгіх год уздзеянне вільгаці, ціск грунту...

Станцыі «Маскоўская» і «Парк Чалюскінцаў» будуць узводзіцца з маналітнага жалезабетону, астатнія будуць уяўляць сабой трохпралётныя рамы з двума радамі калон. Незвычайнай бачыцца станцыя «Цэнтральная плошча». Яна будзе двухяруснай: ніжні — пасажырская платформа, верхні —выставачны салон. Такіх станцый у нашай краіне яшчэ не будавалі.

...Прывычнымі маршрутамі бягуць сёння па Мінску трамваі, тралейбусы, аўтобусы. І ўсё часцей чуюцца ў гадзіны «пік» просьбы ўваходзячых пасажыраў: «Грамадзяне, яшчэ крышку наперад...» Але чаму ўвесь транспарт, які ідзе па Ленінскаму праспекту, зварочвае на вуліцу Друкарскую і ідзе да Валгаградскай? Усё зразумела: каля парка Чалюскінцаў пачынаецца будаўніцтва першай станцыі метро. Зусім нядаўна быў той урачысты дзень, калі ў яе катлаван забілі першыя сваі.

І недалёка той час, калі вадзіцель першага цягніка Мінскага метро скажа: «Асцярожна, дзверы зачыняюцца! Наступны прыпынак...»

● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ

ЗАМЕСТ ХРОМУ—АЗОТ

Вучоныя Беларускага тэхналагічнага інстытута разам са спецыялістамі Бабруйскага завода гумавых тэхнічных вырабаў распрацавалі і ўкаранілі новую, больш танную і простую тэхналогію вырабу прэс-формаў для вулканізацыі. Яны замянілі складаную і працаёмкую аперацыю гальванічнага храміравання на азаціраванне. Насычэнне рабочай паверхні азотам рэзка павысіла яе цвёрдасць і зносатрываласць. Даўгавечнасць прэс-формаў павялічылася амаль удвая, палепшылася таксама і якасць прадукцыі.

У саўгасе «Любань» Вілейскага раёна пасяхова развіваецца авечкагадоўля. Тут пабудаваны авечкагадоўчы комплекс на 2 тысячы галоў, створаны добры племянны статак.
НА ЗДЫМКАХ: агульны выгляд авечкагадоўчага комплексу; заатэхнік Р. ГАМОЛКА аглядае авечак.

Фота У. ЛУПЕЙКІ.

ТУРЫСЦКІ ЛАГЕР НАД ВІЛІЯЙ

Адбыўся V рэспубліканскі турысцкі злёт навучэнцаў прафтэхвучылішчаў—удзельнікаў паходаў па месцах славы савецкага народа.

У маляўнічай лукавіне ракі Віліі, непадалёку ад Маладзечна, разбілі лагер дэлегацыі ўсіх абласцей Беларусі і горада-героя Мінска.

На працягу пяці дзён тут праходзілі спаборніцтвы па праграме ваенна-спартыўнай гульні «Арлёнак» і спартыўнаму арыентаванню, конкурсы аматарскіх кінафільмаў і турысцкіх песень.

ЭКРАН—МОЛАДЗІ

Шырокі паказ кінафільмаў, прысвечаных Дню савецкай моладзі, адбыўся ў гарадах і сёлах рэспублікі. На экраны кінатэатраў і клубаў зноў выпушчаны мастацкія кінастужкі «Камсамольск», «Добраахвотнікі», «Балада аб салдаце», «Маладая гвардыя», «Як гартавалася сталь» і шмат іншых.

Убачылі гледачы і новую шырокаэкранную мастацкую кінааповесць «Ніхто замест цябе», прысвечаную юным патрыётам, членам падпольнай камсамольскай арганізацыі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Шмат цікавага аб гераічных справах і мірных будніях савецкай моладзі расказалі гледачам таксама хранікальна-дакументальныя і навукова-папулярныя кінастужкі.

ПАПЕРА СА ЗНАКАМ ЯКАСЦІ

Малявальную, чарцёжную, сшыткавую, абгортачную і фотапаперу вырабляе Добрушская папяро-

● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ

ЯК НАРАДЗІЎСЯ САЎГАС

У прынятай тры гады назад пастанове ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР «Аб мерах па далейшаму развіццю сельскай гаспадаркі Нечарназёмнай зоны РСФСР» намечана праграма сапраўднага пераўтварэння краю. Вялікую дапамогу ў асваенні нявыкарыстаных зямель цэнтра Расіі аказваюць беларускія спецыялісты.

Да месца дабраліся на ўсюдыходзе. Заглушыўшы рухавік, выйшлі з кабіны і некалькі мінут стаялі моўчкі на беразе ракі Утроі, услухоўваліся ў цішыню адыходзячага дня, углядаліся ў цямнеўшы за ракой лясок, луг у купінах, зарослы хмызняком і асакой.

— Ну вось, — парушыў маўчанне начальнік разведвальнай экспедыцыі Васіль Ермакоў. — Тут і быць саўгасу «Беларускі». — І, звярнуўшыся да галоўнага інжынера будучага праекта Генадзя Азявы, дадаў, канчаткова перавёўшы паэзію прыроднага зачаравання ў прозу праектнага задання.

— Мінеральныя глебы цяжкога механічнага складу. Забалочанасць зямель—94 працэнты.

Нечарназем'е... Сярэднеруская цаліна, як называюць гэтыя землі ў цэнтры Расіі з нядаўняга часу. У слова «цаліна» ёсць два сэнсы. Цаліна — гэта не толькі некранутыя землі, але і край, пераўтвораны працай савецкага чалавека, як землі Заволжа, Казахстана і Прыуралля.

Некранутай цаліной Нечарназёмную зону Расіі ніяк не назавеш — даўным-даўно абжыты пскоўскія, ноўгарадскія, валагодскія землі. Але з-за «неспрыяльных» глеб развіццё сельскай гаспадаркі гэтага рэгіёна значна адставала ад сярэдняга ўзроўню. Гэта ў сваю чаргу стрымлівала тэмпы росту матэрыяльнага дабрабыту людзей, якія тут жывуць.

Саўгас «Беларускі» Пыталаўскага раёна Пскоўскай вобласці, аб якім ідзе расказ, нараджаўся на рабочых сталах і чарцёжных дошках праектнага інстытута «Белгіправадгас» Міністэрства меліярацыі і воднай гаспадаркі Беларускай рэспублікі. Хто, як не беларусы з іх вопытам асваення балоцістага Палесся, могуць дапамагчы суседзям?

Цяжкасцей, з якімі сутыкнуліся праекціроўшчыкі, было нямала. Справа ў тым, што ў гэтым раёне традыцыйнай мясамалочнай жывёлагадоўлі натуральная прадукцыйнасць гектара пашы складала 1 000—1 200 кармавых адзінак у год. Гэта значыць, што кожны гектар угоддзяў мог пракарміць толькі адну карову — не больш. Інжынеры «Белгіправадгаса» знайшлі магчымасць павялічыць у чатыры разы карысную аддачу гектара пашы.

Галоўнай мерай, якая забяспечыць рост прадукцыйнасці кармавой базы, стане меліярацыя. З сямі з палавінай тысяч гектараў, адведзеных новаму саўгасу (раней гэта былі землі пяці гаспадарак), намячаецца асушыць звыш пяці тысяч і арасіць каля тысячы двухсот гектараў. Абноўленая зямля, ачышчаная ад хмызнякоў і купін, пазбаўленая драблення на невялікія нязручныя ўчасткі, дасць магчымасць разгарнуцца магутнай сучаснай тэхніцы, якой раней тут не было ходу. Высокая механізацыя работ, павышэнне культуры выкарыстання зямлі павялічаць удвая—да 35 цэнтнераў — ураджайнасць збожжавых, у пяць разоў — да 450 цэнтнераў — ворыўных культур, у чатыры разы—да 220 цэнтнераў — ураджайнасць зялёнай масы траў.

«Беларускаму» (а яму адводзіцца роля лідэра ў гаспадарцы раёна) трэба будзе асвоіць дзве «спецыяльнасці»: племянную жывёлагадоўлю і вырошчванне насення шматгадовых траў. Пародзістыя цялушкі, якіх тут будуць вырошчваць да трох тысяч штогод, складуць з часам высокапрадукцыйны статак усяго раёна, а 260 тон насення шматгадовых траў, што кожны год будуць прадавацца суседнім гаспадаркам, акажуць істотны ўплыў на ўмацаванне іх кармавой базы.

Цэнтр вытворчай зоны саўгаса — жывёлагадоўчы комплекс па адкорму маладняку. Кампактны, высокамеханізаваны, эканамічны — ён больш папамінае сучаснае прамысловае прадпрыемства з няспынным цыклам вытворчасці, складаным абсталяваннем і спецыялізаваным высокакваліфікаваных работнікаў. Комплекс у 2,3 раза павялічыць прадукцыйнасць адкорму, удвая скараціўшы пры гэтым колькасць занятых у жывёлагадоўлі рабочых.

Але ўзбуйненне вытворчасці — гэта толькі палавіна справы. Бо жыццё не той задачнік, дзе асобна сабраны прыклады «па эканоміцы», а асобна — «па быту». І ствараючы новы саўгас, беларускія праекціроўшчыкі вырашылі складаную комплексную сацыяльную праблему.

На тэрыторыі будучага саўгаса раскідана больш як трыста хутароў. Праект прадугледжвае большасць з іх знесці, вызваліўшы зямлю пад сельгасугоддзі. Трэба было знайсці довады, якія б пераканалі хутаран у змене не проста месца, але і ўсяго складу жыцця, сістэмы поглядаў, ліквідацыі раз'яднанасці людзей, да якой вёў «хутарскі» парадак.

Такім аргументам стаў высокі камфорт новага жылля.

У цэнтры пасёлка Беларускі, разлічанага на паўтары тысячы жыхароў, узнімуцца некалькі двух- і трохпавярховых дамоў гарадскога тыпу. Іх кватэры прызначаюцца, галоўным чынам, для моладзі, схільнай, як паказвае практыка, да «урбанізацыі» свайго ладу жыцця. Пажылыя, сямейныя людзі, якія прывыклі жыць у асобным доме, атрымаюць магчымасць заняць адна- і двухпавярховыя катэджы з прысядзібнымі ўчасткамі. Рабочы саўгаса атрымае дзяржаўную кватэру, але пры жаданні можа будаваць і ўласны дом. Калі яму для гэтага не хопіць сродкаў, атрыманых у якасці кампенсацыі за знесены хутар (гэта сума даходзіць да 10—15 тысяч рублёў), ён змсжа ўзяць у дзяржавы крэдыт.

Культурна-бытавы комплекс уключае школы — агульнаадукацыйную і музычную, Палац культуры з кінатэатрам, камбінат бытавога абслугоўвання, гандлёвы цэнтр, дзіцячы камбінат.

А што ж будзе з прыродай пасля таго, калі будаўніцтва саўгаса завершыцца? Ці не парушыць меліярацыя натуральны біялагічны баланс мясцовасці?

— Меліярацыя — гэта паляпшэнне зямлі,— адказвае намеснік галоўнага інжынера інстытута Леанард Стычынскі. — Наш прынцып такі: усё лішняе — прыбраць, чаго не хапае— дадаць. Прыбяром мы, па сутнасці справы, адны балоты. А дададзім — цудоўныя лугі, два маляўнічыя штучныя возеры, гектары лясных пасадак. Клопат аб ахове прыроднага асяроддзя з'яўляецца састаўной часткай нашага праекта. Напрыклад, для таго, каб заставалася чыстым паветра ў раёне жывёлагадоўчага комплексу, усе гноезборнікі схаваны пад зямлю і прадугледжана перапрацоўка іх змесціва ў сухую арганіку. Сцёкавыя воды комплексу ў раку не трапяць — яны будуць выкарыстоўвацца для штучнага арашэння палёў. Сама абраная намі сістэма меліярацыі — закрыты дрэнаж — будзе ахоўваць раку ад раствораных у ёй мінеральных угнаенняў: вада, прафільтраваная слоем глебы, трапіць у дрэнажныя трубы ўжо чыстай. Структура сельскагаспадарчых угоддзяў складзена так, што асноўныя плошчы зоймуць травы, а гэтым выключаецца эрозія глебы.

Будаўніцтва новага саўгаса на пскоўскай зямлі ўжо ідзе поўным ходам.

П. БАРЫСАЎ.

● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ●

вая фабрыка «Герой працы».

Прадукцыя фабрыкі мае шырокі попыт у краіне. Гэта тлумачыцца яе высокай якасцю. Два віды добрушскай паперы — малявальная і чарцёжная — выпускаюцца з дзяржаўным Знакам якасці.

ФАРЫ СВЕЦЯЦЬ УПРАВА

Серыйная вытворчасць 12-вольтных лямп для легкавых аўтамашын пачалася на Брэсцкім электралямпавым заводзе.

Новыя лямпы адпавядаюць міжнародным стандартам, забяспечваюць неабходную бяспеку руху. Важнейшая іх асаблівасць заключаецца ў тым, што нітка напальвання ў комплексе з экранам дае такое размеркаванне святла, пры якім прамень выходзіць строга накіраванай формы і не дасягае кабіны сустрэчнай машыны. Ён як бы сцелецца па зямлі, высвечваючы няроўнасці дарогі. І яшчэ адна яе вартасць: фара асвятляе шашу так, што далёка відаць правая абочына. Злева прамень абрэзаны і не сленіць вадзіцеляў сустрэчных машын.

Сёлета прадпрыемства вырабіць першыя 200 тысяч лямп для Волжскага аўтазавода. Яны будуць выкарыстоўвацца і ў аўтамабілях «Масквіч» і «Волга».

«БУГ» ПРЫМАЕ АДПАЧЫВАЮЧЫХ

Новы дом адпачынку «Буг», што набудаваны непадалёку ад горада Жабінка, нядаўна прыняў адпачываючых. А побач узводзяцца яшчэ тры карпусы на 160 месц кожны. Неўзабаве будуць абсталяваны спартыўны комплекс, лодачная станцыя, пляж ча рацэ Мухавец.

РЭЛІКВІІ БАЯВОЙ САДРУЖНАСЦІ

Старшыня Савета Міністраў Польскай Народнай Рэспублікі Пётр Ярашэвіч прыслаў клубу «Равеснік» Пружанскага саўгаса-тэхнікума падарунак — узоры знакаў адрознення, галаўныя ўборы Войска Польскага, матэрыялы аб Героі Савецкага Саюза, польскім генерале брыгады, ураджэнцы Пружанічыны Аляксандру Вашкевічу.

У свой час Пётр Ярашэвіч вучыўся ў Пружанскай гімназіі.

Атрыманыя з Варшавы экспанаты паслужаць асновай для новай экспазіцыі ў музеі баявой славы тэхнікума. Яна расскажа аб сумеснай барацьбе народаў Савецкага Саюза і Польшчы супраць фашызму, аб гісторыі Войска Польскага.

ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ

ГАРЫЗОНТЫ НАВУКІ

Паспяхова распрацоўваюць тэарэтычныя асновы прасавання металічных парашкоў, а таксама тэхналагічныя працэсы стварэння разнастайных дэталей супрацоўнікі Навукова-даследчага інстытута парашковай металургіі Беларускага політэхнічнага інстытута. Адзін з самых маладых і перспектыўных НДІ рэспублікі (яму ўсяго пяць год) займае вядучае месца ў краіне сярод устаноў падобнага тыпу.

НА ЗДЫМКУ: старшы інжынер аддзела фізіка-хімічных метадаў даследавання В. ЧЫГРЫНАЎ за работай на ўстаноўцы «Кванты-мет-720».

Фота У. МЯЖЭВІЧА.

АЎТОГРАФЫ ДАЛЁКІХ ЗОРАК

Праз некалькі дзён пасля завяршэння праграмы «Саюз — Апалон» у Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна прыйшла тэлеграма, якую чакалі з нецярпеннем. «...Апаратура выдатна зарэкамендавала сябе ў рабоце», — пісаў акадэмік-сакратар аддзялення агульнай фізікі і астраноміі АН БССР А. Прохараў.

Апаратура, створаная ў навукова - даследчым інстытуце прыкладных фізічных праблем пры БДУ для спецыяльнай астрафізічнай абсерваторыі АН СССР, удзельнічала ў адным з самых складаных эксперыментаў савецка - амерыканскай касмічнай праграмы — пошуку загадкавых «чорных дзірак», або калапсараў. Гэтыя зоркі, існаванне якіх было прадказана тэарэтычна, валодаюць такой каласальнай гравітацыяй, што нават фатоны, якія нясуць святло, не могуць вырвацца з іх палону. Як велізарны пыласос, зорка ўцягвае і паглынае міжзоркавы газ, метэарыты і астэроіды.

Але выявілася, што «чорныя дзіркі» зусім не чорныя, а хутчэй нават светлыя. Аднак характар іх свячэння зусім іншы. Уцягваючы касмічны пыл, яны разганяюць яго да калясветавых хуткасцей. Пылінкі сутыкаюцца, і нараджаецца бясконцае мноства ядзерных узрываў, якія ўтвараюць вакол «дзіркі» ззяючы арэол. Адрозніць такую зорку ад звычайнай вельмі цяжка. Для гэтага трэба весці сінхроннае назіранне ў трох дыяпазонах: радыё, рэнтгенаўскім і аптычным.

І такі комплекс унікальных прыбораў быў створаны беларускімі вучонымі. Ён у многім і забяспечыў поспех эксперыментаў па пошуку «чорных дзірак». З усіх буйнейшых абсерваторый свету, якія вялі назіранне ў аптычным дыяпазоне, толькі абсталяваная беларускай апаратурай змагла атрымаць дадзеныя, падобныя да тых, якія перадавалі з арбіты касманаўты.

Д. ПАТЫКА.

ХІРУРГ УШЫВАЕ ЛАТКУ

У Мінску жыве і выдатна сябе адчувае чалавек, у целе якога хірургі нядаўна пакінулі... кавалак марлі. Але не па рассеянасці. Выпрабоўвалася растваравочая тканіна для пратэзавання, створаная вучонымі Інстытута агульнай і неарганічнай хіміі АН БССР, Беларускага навукова-даследчага інстытута пералівання крыві і Беларускага дзяржаўнага універсітэта. «Латка», або мембрана, з такой марлі адыгрывае ролю арматуры, якая паступова абрастае нервамі, сасудамі, злучальнай тканкай і толькі потым разбураецца.

Медыцыне вядомы падобныя матэрыялы, але яны, на жаль, маюць вельмі істотны недахоп — пачаўшы рассасвацца, губляюць трываласць і ўжо не могуць вытрымаць значных нагрузак. У той жа час валокны, якія не растваравоцца, перашкаджаюць жывой тканцы заняць іх месца.

Звычайныя баваўняныя ніткі, апрацаваныя па прапанаванаму хімікамі метаду, набываюць здольнасць рассасвацца ў арганізме, прычым тэрміны растварэння залежаць ад працягласці апрацоўкі. Марля, сатканая з розных нітак, губляе трываласць паэтапна, і жывая тканка паспявае запоўніць месца валокнаў.

У навінкі ёсць і яшчэ адна перавага перад сваімі сінтэтычнымі папярэдніцамі. Клеткі «ўжываюцца» з ёю, таму што яна актыўна ўдзельнічае ў абмене рэчываў. І сама аснова нітак, і напаўняльнікі, якімі іх прамачылі, складаюцца з тых жа рэчываў, што ўтрымліваюцца ў арганізме.

Для гэтай незвычайнай тканкі, абавязанай сваім нараджэннем медыцыне, нечакана знайшлася работа і ў харчовай прамысловасці. Яна аказалася здольнай выцягваць з віна іоны металаў, якія праслізгвалі да гэтага часу праз любыя фільтры. Ачыстка з дапамогай новага матэрыялу дазваляе рабіць віны празрыстымі, пазбаўляць іх ад пабочных пахаў. Такія фільтры здольны лёгка «ўзяць» з каровінага малака няўлоўны кальцый. Дыэтычныя прадукты, атрыманыя з прайшоўшай апрацоўку сыравіны, будуць адрозніваецца высокай якасцю.

П. ДЗМІТРЫЕЎ.

Крокі Кастрычніка

ГОД 1951-ы

Працоўныя рэспублікі пачалі выкананне пятага пяцігадовага плана. Дырэктывамі пяцігодкі былі пастаўлены вялікія задачы ў развіцці народнай гаспадаркі Беларусі. Прадугледжваўся рост валавой прадукцыі прамысловасці на 75—80 працэнтаў. Пераважнае развіццё атрымалі галіны цяжкай індустрыі. У рэспубліцы шырока разгарнулася капітальнае будаўніцтва. Асабліва высокімі тэмпамі павінна была развівацца металаапрацоўчая, машынабудаўнічая, паліўна-энергетычная прамысловасць.

Пяты пяцігадовы план прадугледжваў далейшае развіццё сельскай гаспадаркі— пашырэнне пасяўных плошчаў, павышэнне ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур, павелічэнне грамадскага пагалоўя жывёлы і яго прадукцыйнасці. Прадугледжвалася значнае павышэнне матэрыяльнага і культурнага ўзроўню працоўных БССР.

У ЛЮТЫМ самазвалы Мінскага аўтазавода былі ўпершыню адпраўлены на Усесаюзную сельскагаспадарчую выстаўку, дзе атрымалі высокую ацэнку.

І САКАВІКА ўступіў у строй дзеючых першы на Беларусі цукровы завод у Скідалі.

13 ЖНІЎНЯ выпусціў першую прадукцыю Мінскі падшыпнікавы завод.

У сталіцы рэспублікі пачалося будаўніцтва буйнога камвольнага камбіната, які спецыялізуецца на выпуску розных тканін і пражы.

І КАСТРЫЧНІКА пачаліся заняткі ў Гродзенскім сельскагаспадарчым інстытуце.

ГОД 1952-і

30 СТУДЗЕНЯ—І ЛЮТАГА адбыўся XVII з'езд ЛКСМБ, які падвёў вынікі ўдзелу камсамольцаў Беларусі ў барацьбе за аднаўленне і развіццё народнай гаспадаркі і культуры рэспублікі. 722 дэлегаты прадстаўлялі на з'ездзе 511 тысяч камсамольцаў. У пасляваенныя гады камсамол Беларусі з'явіўся арганізатарам моладзі на барацьбу за датэрміновае выкананне пяцігадовых планаў і ўзначаліў сацыялістычнае спаборніцтва маладых рабочых і калгаснікаў за далейшае развіццё народнай гаспадаркі і культуры.

28 ЛЮТАГА заснаваны Дзяржаўны хор Беларускай ССР.

15 САКАВІКА выпусціў першую прадукцыю Бабруйскі завод гумавых вырабаў.

4 ВЕРАСНЯ адкрыты Інстытут цепла- і масаабмену Акадэміі навук БССР.

20—23 ВЕРАСНЯ праходзіў XX з'езд Камуністычнай партыі Беларусі. За перыяд паміж XIX і XX з'ездамі колькасны склад Кампартыі Беларусі павялічыўся на 17 877 чалавек і к XX з'езду КП(б)Б налічвала 127 987 камуністаў. Значна павялічылася ў Кампартыі Беларусі ўдзельная вага рабочых і калгаснікаў, палепшылася расстаноўка партыйных сіл у прамысловасці і сельскай гаспадарцы.

З'езд канстатаваў, што ў БССР хуткімі тэмпамі растуць такія важныя галіны прамысловасці, як энергетычная, паліўная, лясная, машынабудаўнічая, будаўнічых матэрыялаў, узмоцнена развіваюцца аўтамабілебудаванне, вытворчасць падшыпнікаў, матацыклаў, веласіпедаў, дарожных і будаўнічых машын.

З'езд адзначыў, што ў заходніх абласцях БССР у асноўным завершана калектывізацыя сялянскіх гаспадарак.

30 СНЕЖНЯ здадзена ў эксплуатацыю першая чарга Мінскага радыёзавода.

У гэтым жа годзе было створана Беларускае таварыства культурных сувязей з заграніцай, якое адыграла вялікую ролю ў развіцці культурных сувязей з замежнымі краінамі. (У 1958 годзе таварыства пераўтворана ў Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі.)

за мяжой і дома

АСЦЯРОЖНА: БІЯСФЕРА!

Газ, як самае «чыстае» паліва, заваёўвае ўсё большае прызнанне ў работнікаў вытворчасці. З кожным годам новыя і новыя прадпрыемствы перабсталёўваюцца для работы на «блакітным паліве», распрацоўваюцца меры па больш рацыянальнаму яго выкарыстанню.

За мінулую пяцігодку ў рэспубліцы спажыванне газу як сыравіны для вытворчасці мінеральных угнаенняў узрасло у 1,6 раза, для патрэб машынабудавання, металаапрацоўкі і прамысловасці будаўнічых матэрыялаў — амаль у 1,2 раза. Пры гэтым эканамічны эфект склаў за пяць гадоў 150 мільёнаў рублёў.

Высокімі тэмпамі развіваецца на Беларусі газазабеспячэнне жылых дамоў. На гэтыя патрэбы выкарыстоўваецца амаль увесь паступаючы ў рэспубліку звадкаваны газ. Зараз каля 90 працэнтаў кватэр у гарадах і амаль 40 працэнтаў на сяле газіфікаваны.

Асаблівую ўвагу ў нашай рэспубліцы надаюць прадухіленню забруджвання навакольнага асяроддзя і асабліва ў раёнах нафтаздабычы і падземных газасховішчаў.

Аб гэтым далажылі прадстаўнікі Беларускай ССР на міжнародным сімпозіуме па газавай прамысловасці і навакольным асяроддзі, які закончыўся 25 чэрвеня ў Мінску. Сімпозіум быў арганізаваны Еўрапейскай эканамічнай камісіяй ААН. Прадстаўнікі 17 еўрапейскіх і 9 краін, што сталі на шлях развіцця, абмеркавалі канкрэтныя прапановы і меры, якія прадпрымаюць дзяржавы Еўропы па ахове біясферы. Аб тым, як ахоўваецца навакольнае асяроддзе ў нашай краіне, яны змаглі даведацца, наведаўшы кампрэсарную станцыю газаправода Таржок — Мінск — Івацэвічы і азнаёміўшыся на месцы з вопытам Мінскага трактарнага завода па пераводу на газ тэхналагічных працэсаў.

Палац культуры ў Пінску.

Фота Я. КАЗЮЛІ.

3 ЛІПЕНЯ— ДЗЕНЬ ВЫЗВАЛЕННЯ БЕЛАРУСІ



Мінск... Быццам цудоўная птушка-фенікс паўстаў ён з попелу Вялікай Айчыннай вайны. Горад-герой зноў малады, прыгожы, быццам не прашумелі над ім дзевяць стагоддзяў.

Сёння Мінск — у святочным убранні. Кумачом апрануўся Ленінскі праспект, упрыгожыліся вуліцы і плошчы. З ліпеня сталіца адзначыла свята — Дзень вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. І зноў удзячныя мінчане, шматлікія госці сталіцы аддавалі даніну памяці тым, хто выстаяў у суровай схватцы з ворагам, хто цаной свайго жыцця наблізіў сённяшні мірны дзень. Навечна застыў на пастаменце танк, які першым уварваўся ліпеньскім днём 1944 года ў беларускую сталіцу, каб ачысціць яе ад фашыстаў, у вянках і букетах помнікі тым, хто загінуў.

НА ЗДЫМКАХ: ва ўскладанні вянкоў да помніка-абеліска на плошчы Перамогі прынялі ўдзел кіраўнікі Кампартыі і ўрада рэспублікі; маляўнічае тэатральна-спартыўнае відовішча было наладжана ў гэты дзень на стадыёне «Дынама».

Фота У. КІТАСА і М. ХАДАСЕВІЧА.

РЕЛИГИОЗНЫЕ ДЕЯТЕЛИ ПРИЗЫВАЮТ К МИРУ

В гостеприимной Москве с 6 по 10 июня проходила Всемирная конференция «Религиозные деятели за прочный мир, разоружение и справедливые отношения между народами». 663 участника Конференции из 107 стран мира — буддисты, индуисты, иудеи, мусульмане, сикхи, синтоисты и христиане обсуждали самые актуальные проблемы современности. На Конференции были представлены все международные религиозные организации. В заседаниях этого миротворческого форума приняли участие многие выдающиеся религиозные деятели, крупнейшие богословы, видные государственные и общественные деятели, лауреаты Международной Ленинской премии «За укрепление мира между народами» и Нобелевской премии мира.

Участники Конференции с воодушевлением восприняли послание Председателя Совета Министров СССР А. Н. Косыгина, в котором он от имени Советского правительства и от себя лично сердечно приветствовал участников этого форума, дал высокую оценку целям Конференции и высказал ее участникам пожелания успеха в благородном миротворческом служении.

Бурными аплодисментами участники Конференции одобрили ответное послание главе Советского правительства. В послании отмечаются усилия Советского правительства в борьбе за мир и выражается пожелание многоплодного продолжения усилий ради процветания Страны Советов и утверждения мира на земле.

Приветственные послания в адрес этой высокой Конференции были получены также от Генерального Секретаря ООН Курта Вальдхайма, Президента Республики Либерии Уильяма Р. Толберта, Президента Республики Кипр архиепископа Макариоса, Премьер - Министра Непала Тулзи Гири, Председателя Президиума ЦК Отечественного фронта Социалистической Республики Вьетнам Хоанг Куок Вьета.

В первый день работы Конференции ее участники заслушали на своих пленарных заседаниях основной доклад, с которым выступил муфтий Зияутдин Хан ибн Ишан Бобахан (СССР), а также содоклады каноника Буржеса Карра (Кения) — «За прочный мир», каноника Раймона Гоора (Бельгия) — «За разоружение» и митрополита Павла мар Григория Вергезе (Индия) — «За справедливые отношения между народами».

Во второй и третий день работы участники Конференции вели дискуссии в трех

[Окончание на 6-й стр.]

НАШ ОСНОВНОЙ ЗАКОН

СОВЕТСКИЙ РЕФЕРЕНДУМ: ОТ ОДНОГО ДО МИЛЛИОНА ПРЕДЛОЖЕНИЙ

Все центральные советские газеты опубликовали проект новой Конституции. Она заменит собой нынешний, действующий уже более сорока лет, Основной закон страны. Новая Конституция призвана отразить глубокие изменения, которые произошли в советском обществе, законодательно закрепить социальные завоевания советского народа, развитие принципов социалистической демократии.

Какую конкретную форму примут те или иные статьи Конституции, говорить пока рано. Окончательный ее текст будет утвержден лишь после всенародного обсуждения проекта, после анализа всех предложений, поправок, критических замечаний. А то, что поправки будут, можно не сомневаться. Это подтверждает многолетняя практика широкого обсуждения общественностью важнейших государственных актов СССР.

Такие дискуссии — давняя советская традиция. В связи с этим приходит на память эпизод первых лет Советской власти. В 1918 году рядовая работница предложила проект декрета (закона) об отпусках. Ее письмо было изучено членами Советского правительства во главе с В. И. Лениным, и вскоре такой декрет был издан.

А вот пример наших дней. В ходе дискуссии по поводу проекта Основных направлений развития народного хозяйства СССР на 1976 — 1980 годы, вынесенного на всенародное обсуждение Центральным Комитетом КПСС, поступило свыше миллиона откликов—замечаний, предложений и т. п.

Цель этих обсуждений — выявить все точки зрения, учесть все деловые предложения. Ведь одна из характерных черт советской демократии именно в том и состоит, чтобы в отдельных, иногда частных мнениях видеть общественные интересы. Законы в СССР принимает высший орган власти — Верховный Совет. Но высказать свое мнение по поводу законопроекта, внести предложение об издании нового постановления может каждый гражданин.

Как это происходит практически? Проекты важнейших законодательных актов публикуются многомиллионными тиражами на языках всех союзных и автономных республик центральной и республиканской печатью. (Так, тираж «Правды» — 11 миллионов экземпляров, «Известий» — 8 миллионов и т. д.) Таким образом, законопроект делается доступным каждой советской семье, каждому человеку. И любой человек может высказать свое мнение — на собрании, в печати, в письме в государственную или общественную организацию.

В Верховном Совете СССР том за томом накапливаются предложения. В них — одобрение и критика, поправки и новые формулировки статей закона. Все они тщательно изучаются членами подготовительной рабочей комиссии, ведущей работу над законопроектом, а затем и депутатами постоянных комиссий обеих палат советского парламента. О наиболее важных предложениях, которые включаются в текст нового закона, сообщает на сессии Верховного Совета СССР представитель правительства или председатель депутатской комиссии.

Важнейшие законопроекты вызывают тысячи и десятки тысяч откликов. Многие из них находят затем отражение в окончательной редакции текста закона. Например, на основе предложений советских граждан было сформулировано 16 статей Основ законодательства о труде, семь статей Закона о пенсиях, целый ряд статей Основ законодательства о браке и семье. Кроме того, было внесено не поддающееся подсчету количество поправок, дополнений, уточнений.

Часто бывает трудно назвать автора последнего варианта той или иной поправки, поскольку она проходит несколько редакций, уточнений, не один раз трансформируясь при этом. Но главное — все предложения направлены на совершенствование, улучшение законодательства. Причем интересы законодателей и граждан, обсуждающих проект, едины — благо советского народа, укрепление социалистического государства, развитие демократии. Вот почему любое предложение, улучшающее законопроект в этом направлении, всегда находит поддержку в советском парламенте.

Вот самые последние факты. Три месяца назад в печати был опубликован проект Основ лесного законодательства Союза ССР и союзных республик. Индивидуальные и коллективные отклики на него идут в редакции газет, в постоянные депутатские комиссии палат Верховного Совета СССР. Что волнует советских граждан? В первую очередь, разделы законопроекта о защите лесов. В письмах предлагается усилить охрану лесов, принимать более строгие меры к нарушителям закона, энергичнее восстанавливать и разводить леса. Дискуссия продолжается, а в подготовительной комиссии уже рассмотрено свыше полутора тысяч конкретных замечаний и предложений. Более двухсот из них нашли отражение в поправках.

Так в СССР рождается большинство важнейших законодательных решений: после всенародного их обсуждения, анализа и учета многочисленных поправок и предложений трудящихся. И это является сознательно проводимой политической линией. Кстати, в проекте новой Конституции такой порядок принятия важнейших государственных актов предложено закрепить юридически, сделать обязательным. А сама Конституция будет поставлена на голосование лишь после всенародного обсуждения ее проекта.

Юрий КОРОЛЕВ,
заведующий отделом при Секретариате Президиума Верховного Совета СССР.

НА ЗЯМЛІ БАЦЬКОЎ

«ВАША СІСТЭМА ПЕРАМАГАЕ»

ПЕРШАЯ СЁЛЕТА ТУРЫСТЫЧНАЯ ГРУПА СУАЙЧЫННІКАЎ СА ЗЛУЧАНЫХ ШТАТАЎ АМЕРЫКІ НАВЕДАЛА МІНСК

— КАЛІ я збіраўся ў гэтую паездку, — сказаў кіраўнік групы, адвакат з Кліўленда Герасім Лубяшкоў, — то думаў, што ведаю аб вашай краіне амаль усё. Я шмат чытаю аб Савецкім Саюзе, часта сустракаюся з савецкімі людзьмі ў ЗША, ды і паездка гэтая ўжо не першая. Аднак тое, што я ўбачыў, пераўзышло ўсе мае чаканні. Я адкрыў для сябе цудоўную краіну, праўду аб якой у Амерыцы спрабуюць сказіць усімі сродкамі.

Не хавалі свайго шчырага захаплення нашай краінай і іншыя госці, з якімі мне давялося гутарыць у час экскурсій і сяброўскіх сустрэч турыстаў на беларускай зямлі.

Зразумела, каб скласці канчатковае ўяўленне аб краіне, дзе ўвесь лад жыцця не падобны на той, да якога прызвычаіліся нашы госці, мала адной нават самай цікавай паездкі. Але суайчыннікі з Амерыкі не проста турысты. У кожнага з гэтых немаладых людзей жывы ўспамін аб той гаротнай Беларусі, якую яны або іх бацькі пакінулі шмат гадоў назад. Гэтая памяць дапамагала рабіць параўнанні.

БАРЫС Адамовіч не спяшаўся з вывадамі. Першыя дні ён неяк асабліва пільна ўглядаўся ў гарадскія краявіды, што праплывалі за вокнамі аўтобуса, і толькі зрэдку рабіў кароткія заўвагі сваім сябрам. Пытанне, з якім ён звярнуўся да мяне пад час адной з такіх экскурсій, было зусім нечаканым:

— Скажыце, адкуль у Савецкім Саюзе столькі будаўнікоў? Ні ў адным горадзе ЗША я не бачыў такой колькасці пад'ёмных кранаў, як у вас — усюды суцэльная будоўля!

Цікавасць нашага госця была невыпадковая. Барыс Адамовіч сам па прафесіі будаўнік, і як спецыялісту яму важна было ведаць усё да дробязей: якая тэхніка працуе на пляцоўках, якая тэхналогія ўжываецца, колькі зарабляюць савецкія будаўнікі... Як сапраўднае адкрыццё было для нашага госця тое, што і тэхніка, і тэхналогія, і тэрміны ўзвядзення дамоў у Савецкім Саюзе і ЗША падобныя. Не падобным аказалася толькі тое, для каго ўзводзяцца дамы.

— У Амерыцы таксама будуюць нямала, — гаварыў Адамовіч, — але шмат кватэр пустуе, бо каштуюць вельмі дорага. Тут я даведаўся, што толькі за пасляваенныя гады Мінск вырас у 9 разоў і ўсё жыллё прадастаўляецца гараджанам бясплатна. Тыя новабудоўлі, якія я бачыў у Мінску, выглядаюць надзвычай прыгожымі і ўтульнымі. Будаваць у вас умеюць.

Уражанні свайго земляка дапаўняе Павел Коржык:

— Я не ўпершыню ў Савецкім Саюзе, але кожны раз мяне больш за ўсё захапляе тое, як у вас рашаецца жыллёвае пытанне. У Амерыцы я маю двухпакаёвую кватэру і плачу за яе ў месяц 180 долараў з 550 долараў пенсіі. Тут, у СССР, гаспадар плоціць за сярэднюю двухпакаёвую кватэру крыху больш за 10 рублёў, што складае толькі каля 5 працэнтаў расходаў сям'і. У мяне шмат родных у Мінску і ў вёсках, і ўсе забяспечаны добрымі кватэрамі. Нам расказалі, што ў новай Канстытуцыі СССР, якую вы зараз абмяркоўваеце, замацавана права кожнага савецкага грамадзяніна на жыллё. Гэта цудоўнае права, аб якім працоўныя ў капіталістычным свеце не могуць нават і марыць.

АБ НОВАЙ савецкай Канстытуцыі, што на справе гарантуе чалавеку ўсё неабходнае для шчаслівага жыцця, амерыканскія госці ўспаміналі яшчэ не аднойчы. Так было, напрыклад, у час іх знаёмства з работай адной з мінскіх паліклінік. Гэтай паездкі турысты чакалі з асаблівай нецярплівасцю. І не толькі таму, што цікава было даведацца, як лечаць хворых у СССР. Многія з гасцей разлічвалі сумясціць прыемнае з карысным — атрымаць кансультацыю ў савецкіх медыкаў. Не, не таму што амерыканскія ўрачы нібыта горшыя. Проста гэта была рэдкая ў іх жыцці магчымасць выкарыстаць дапамогу ўрача бясплатна.

Турысты з цікавасцю аглядалі вялікі шматпавярховы будынак паліклінікі, хадзілі па кабінетах, дзе вядзецца прыём наведвальнікаў, зазірнулі нават у лабараторыю і працэдурныя пакоі. Тлумачэнні даваў галоўны ўрач Валерый Мірановіч.

Многа незвычайнага для сяброў пачулі ад яго амерыканскія госці. Напрыклад, як было не здзіўляцца, калі яны даведаліся, што савецкія ўрачы не толькі па першаму ж выкліку прыязджаюць да хворых дамоў, але па ўласнай ініцыятыве рэгулярна аглядаюць іх, правяраюць стан здароўя насельніцтва ў сваіх раёнах. Асаблівыя клопаты праяўляюцца аб жанчынах і дзецях. Комплекс гэтых мерапрыемстваў уключае прафілактычныя агляды, прышчэпкі, спецыяльныя працэдуры для будучых маці, абавязковы кантроль за здароўем кожнага нованароджанага, лячэнне хворых у спецыяльных клініках, санаторыях і шмат іншых медыцынскіх і сацыяльных даброт. Зразумела, як і любое медыцынскае абслугоўванне ў СССР, гэта дапамога аказваецца бясплатна.

У той Беларусі, якую шмат дзесяцігоддзяў назад пакідалі тысячы абяздоленых сялян, урачоў практычна не было. Сёння ў рэспубліцы працуюць дзесяткі тысяч медыкаў. Бальніцы, паліклінікі і амбулаторыі пабудаваны ва ўсіх населеных пунктах, і кожны жыхар мае магчымасць неадкладна атрымаць самую кваліфікаваную медыцынскую дапамогу. Гэтае права таксама гарантавана савецкай Канстытуцыяй.

— Мы можам толькі пазайздросціць таму, як у вас наладжана ахова здароўя, — сказаў Майк Цвіг, калі пасля знаёмства з паліклінікай госці і ўрачы сабраліся за шклянкай кавы.— Для нас, амерыканцаў, няма большай бяды, як захварэць. Любая, нават нязначная, немач можа пазбавіць нас і работы, і ўсіх сродкаў. Толькі адзін дзень, праведзены на бальнічным ложку, каштуе 120 долараў. Плаціць, акрамя таго, даводзіцца за кожны аналіз, кожную кансультацыю ці візіт урача... А каб разлічыцца за аперацыю, людзям нярэдка даводзіцца залазіць у даўгі. Таму кожны з нас, адмаўляючы ў многім, усё жыццё адкладае грошы, як мы гаворым, «на дажджлівы дзень», калі давядзецца мець справу з дактарамі.

ШМАТ яшчэ цікавых спатканняў з савецкай рэчаіснасцю было ў нашых гасцей у час іх знаёмства з Беларуссю. Пабывалі турысты ў піянерскім лагеры, дзе адпачываюць летам мінскія школьнікі. Гасцям спадабаўся і лагер, і маляўнічы бор, дзе ён размешчаны, і меню дзіцячай сталовай. Але больш за ўсё — канцэрт, які піянеры наладзілі ў гонар амерыканскіх турыстаў. Думку ўсіх выказала Соф'я Сербут з Чыкага:

— Бацькі гэтых школьнікаў, пэўна, шчаслівыя людзі, бо ім не даводзіцца хвалявацца за лёс сваіх дзяцей. У іх выдатныя выхавацелі.

У час паездкі на радзіму народнага паэта Беларусі Янкі Купалы — у вёску Вязынка гасцей запрасіла да сябе адна з калгасніц. Сустрэча не была прадугледжана праграмай, і таму аказалася для многіх прыемным сюрпрызам.

Прасторны новы пяцісценак свабодна ўмясціў усіх жадаючых, госці разышліся па пакоях, разглядалі абстаноўку. Усё, як і ў іх гарадскіх кватэрах: тэлевізар, халадзільнік, пральная машына, газавая пліта, зручная мэбля. Не, гэта зусім не тая хата, што яны толькі што бачылі ў этнаграфічным музеі — з вузкімі акенцамі ды жабрацкім сялянскім начыннем, развешаным па неатынкаваных сценах. Ды і наогул, няма больш на Беларусі тых сумных вёсак, што памятныя нашым суайчыннікам з часоў іх маленства. Усё змянілася непазнавальна.

— Ваша сістэма ўпэўнена перамагае, — падагуліў свае ўражанні аб усім убачаным Герасім Лубяшкоў. — Я маю на ўвазе не толькі вашы бясспрэчныя эканамічныя поспехі. Зараз на Захадзе шмат разважаюць аб тым, што ў СССР быццам бы парушаюць правы чалавека. Дык вось мы на ўласныя вочы пераканаліся, што нідзе чалавек на справе не мае столькі правоў і свабод, як у сацыялістычным грамадстве.

Гэтая паездка была вельмі карысная для нас. Цяпер, калі мы вернемся ў ЗША, нам будзе што адказаць тым, хто паклёпнічае на нашу Радзіму.

Вячаслаў ХАДАСОЎСКІ.

Нашы суайчыннікі наведалі мемарыяльны комплекс Хатынь.
Фота Я. КАЗЮЛІ.

«Голас Радзімы»
№ 27 (1493), 1977 г.

ОТ КАКОЙ ДЕМОКРАТИИ МЫ ОТКАЗЫВАЕМСЯ?

„ПО БЛАГОСТИ всевышнего, — горько иронизировал великий сатирик Марк Твен, — мы, американцы, владеем тремя неоценимыми дарами: свободой слова, свободой совести и благополучной решимостью не пользоваться ими». Это было сказано около ста лет назад, и в мире многое изменилось с тех пор. Однако одно осталось незыблемым: в Соединенных Штатах и в других капиталистических странах и по сей день в избытке рассуждения о демократии, свободе, правах человека. Но подлинной свободы и реальной демократии для всех, действительных прав для каждого человека там нет.

Подавляющее большинство населения любой страны представляют люди труда. Для них демократия приобретает значение в том случае, если она проявляется не в виде абстрактных пожеланий, выступает не в отвлеченной форме, а выражается во вполне конкретных правах и свободах: праве на труд, образование, свободе собраний, союзов, печати, отсутствии расовой и национальной дискриминации, возможности свободного выбора профессии, своего будущего.

ГАРАНТИЯ БЕЗРАБОТИЦЫ

Предоставляет ли мир «равных возможностей», общество «всеобщего благоденствия», как называют буржуазные идеологи капиталистические страны, такие права и свободы трудящимся? И вопрос этот задать нужно не в оффисах пропагандистских контор и рекламных компаний, а у ворот заводов и фабрик, тех капиталистических предприятий, пороги которых безуспешно обивают сегодня 16 миллионов безработных. Именно такова численность армии «лишних» людей в странах развитого капитализма. И хотя авторы широковещательных программ о борьбе с безработицей на Западе не раз заявляли о стремлении уничтожить это социальное зло, для людей, лишенных работы, эти обещания остаются пустым звуком. Более того, безработные помнят, что еще четыре года назад их число было вдвое меньшим.

Мир социализма устанавливает прочные гарантии права на труд. Это право обеспечивается в СССР непрерывным ростом общественного производства, которое не знает кризисов и своим главным назначением имеет систематическое повышение благосостояния народа.

МАТЕРИАЛЬНОЕ НЕРАВЕНСТВО

Поборники «свободы» на Западе полностью игнорируют социальное содержание самого понятия «демократия». Выступая с позиций превознесения «прав» человека в капиталистическом мире, они не упоминают о том, что эти права обеспечиваются здесь прежде всего в зависимости от величины частного капитала. Трудящемуся большинству «свободные общества» на деле предоставляют одну возможность — быть объектом эксплуатации, извлечения максимальных прибылей для тех, в чьих руках находятся орудия и средства производства. «В такой свободе, — писал один из руководителей американских коммунистов Г. Аптекер, — всегда имеется нечто от свободы волка, задирающего овцу...» И эти слова не просто метафора.

Постоянно растущая интенсификация труда на капиталистических предприятиях приводит к резкому увеличению случаев травматизма на производстве, росту нервной и психической перегрузки. Все чаще приходится прибегать к услугам врача, а обходится это весьма недешево. В США, например, за каждые сутки пребывания в больнице надо платить не менее 100 долларов, и малообеспеченные люди вынуждены обращаться к врачу лишь в исключительных случаях.

Гражданину социалистической страны гарантирована не только бесплатная медицинская помощь: вся система здравоохранения и социального обеспечения в мире социализма проникнута заботой общества о людях труда. Так, пенсионный возраст в СССР установлен значительно ниже, чем в большинстве капиталистических стран. Причем в Англии, например, размеры пенсий составляют лишь 25 процентов прежней заработной платы, а в Советском Союзе — от 50 до 100 процентов.

«Защитники» прав человека, которых так много появилось сейчас на Западе, не включают в круг своих забот такую проблему, как, например, жилищная. Причины вполне понятны: сравнения и здесь далеко не в пользу капитализма. Квартирная плата «съедает» сегодня от 30 до 50 процентов дохода рабочих семей в капиталистических странах. Тысячи людей вынуждены жить в трущобах, бидонвиллях, в то время как многие дома пустуют из-за непомерно высокой платы: пустых квартир только в ФРГ насчитывается около 400 тысяч.

В СССР такая ситуация попросту невозможна. Конечно, не все еще решено в этой области, но положение улучшается с каждым годом.

ДУХОВНОЕ ОБНИЩАНИЕ

В США, которые буржуазные идеологи представляют как витрину западного общества, до сих пор насчитывается 23 миллиона неграмотных. Формально здесь все равны, и каждый может поступить в любое учебное заведение, но на деле это «равенство» вырождается в фикцию. Американский журнал «Юнайтед Стейтс ньюс энд уорлд рипорт» сообщил, что плата за посещение университета составляет от 3,2 до 4 тысяч долларов в год, а в некоторых штатах и того больше: 5—6 тысяч долларов. Нетрудно подсчитать, много ли выходцев из семей рабочих реально могут воспользоваться правом на образование. Как могут в этом случае получить образование представители национальных меньшинств, которые в «обществе равных возможностей» низведены до уровня граждан «второго сорта»?

Свободы и права только тогда имеют значение для человека, когда они не просто декларируются, а когда под них подводится материальное обеспечение, гарантируется их осуществление, когда они становятся составной частью образа жизни людей. Именно такая демократия и существует в социалистическом обществе. «Мы, — говорил Генеральный секретарь ЦК КПСС Л. И. Брежнев в речи на Конференции коммунистических и рабочих партий Европы в Берлине, — создали общество, свободное от господства монополистической олигархии, свободное от страха перед кризисами, безработицей, свободное от социальных бедствий. Мы создали общество людей равноправных в самом широком смысле слова, не знающих сословных, имущественных, расовых или иных подобных привилегий, общество, которое не только декларирует права человека, но и обеспечивает на деле возможность их использования».

Сейчас в моей стране обсуждается проект новой Конституции Союза Советских Социалистических Республик. Все, кто уже познакомился с ним, отмечают, что главное направление того нового, что содержит проект, — это расширение и углубление социалистической демократии. Значительно обогащены положения действующей Конституции о правах советских граждан, затрагивающих самые основы жизни людей: право на труд, отдых, охрану здоровья, на образование и другие.

ПОПРАНИЕ ПРАВ ЧЕЛОВЕКА

Именно капитализм лишает граждан элементарных свобод, попирает права человека самым беззастенчивым образом. Печать западных стран часто рассказывает о том, как тщательно организованы на Западе и постоянная слежка за свободомыслящими, и подслушивание телефонных разговоров граждан, и перлюстрация их корреспонденции, и сеть платных осведомителей, и ведение досье на сотни тысяч людей. Более 5 лет в ФРГ используются для борьбы с демократами «запреты на профессии». В ведомстве министерства внутренних дел проверке лояльности подвергалось более 800 тысяч человек, более 3 тысяч из них уволено. К «пожизненной безработице», как отмечают некоторые газеты, люди подчас приговариваются за участие в пасхальном марше против атомного вооружения, попытки помешать неофашистской НДП провести предвыборный митинг, за обсуждение в классе темы о гитлеровских концентрационных лагерях.

«...Буржуазия, — отмечал В. И. Ленин, — создает или отменяет демократию, смотря по тому, что ей выгоднее!» Английской буржуазной прессой не раз превозносились стандарты британской демократии. Осталось только подсчитать общее число ирландцев, испытавших на себе все ее «прелести». Когда процесс в Страсбурге подтвердил, что английские власти широко используют в борющемся Ольстере истязания и пытки, схожие с методами средневековой инквизиции, пресса Флит-стрит сделала все, чтобы скрыть преступления британской военщины от широкой общественности. Сообщения о суде в защиту прав человека были упрятаны на внутренние полосы газет, а английское телевидение не посвятило и кадра его заседаниям.

Примечательно то, что организаторы шумной кампании «защиты прав человека в социалистических странах» — это те же, кто молчал во время массовых злодеяний во Вьетнаме, Лаосе и Камбодже, поддерживал фашистские режимы в Испании, Португалии и Греции, это те, кто сейчас проявляет трогательную заботу о режиме Пиночета, Пак Чжон Хи, Смита и Форстера. Они молчат о судьбах «уилмингтонской десятки», тысяч других политических заключенных «свободного мира».

Цель инициаторов нынешней кампании за «права человека» — затормозить прогрессивную разрядку и, если удастся, парализовать ее. Не случайно особого накала шумиха достигла сейчас, в преддверии Белградской встречи представителей стран — участниц общеевропейского совещания. Эту встречу «ревнители демократии» хотели бы превратить в перепалку, с тем чтобы заблокировать путь к дальнейшей нормализации межгосударственных отношений и миру.

Валерий КОВАЛЕНКО,
кандидат философских наук.

РЕЛИГИОЗНЫЕ ДЕЯТЕЛИ ПРИЗЫВАЮТ К МИРУ

[Окончание. Начало на 4-й стр.]

рабочих группах, соответственно темам содокладов. Первая группа обсудила вопросы межрелигиозного сотрудничества в миротворческом служении, рассмотрела проблемы разрядки международной напряженности и политические конфликты, а также роль неправительственных организаций и ООН в утверждении мира. Вторая группа обсуждала проблему разоружения, задачи и возможности общественности в борьбе с накоплением оружия в различных странах и предотвращения международной торговли оружием. Третья группа исследовала религиозный подход к человеческой личности и к отношениям между народами и государствами, проблемы борьбы с расизмом и ряд других жизненно важных проблем современной международной жизни.

В четвертый день работы Конференции состоялись встречи ее участников по религиям, где религиозные деятели обсуждали специфические задачи своих религий по развитию и осуществлению идей и решений Конференции.

На заключительных пленарных заседаниях участники Конференции приняли два заключительных документа: «Обращение к религиозным деятелям и верующим всех религий во всем мире» и «Обращение к правительствам всех стран, участвующих в Конференции».

В Обращении к религиозным деятелям и верующим подчеркивается важность межрелигиозного сотрудничества в миротворческом служении. В Обращении говорится: «Наши религиозные расхождения не смогли разделить нас, ибо наши нравственные заботы оказались схожими, в нашей озабоченности судьбами всего человечества нашли мы общую точку соприкосновения». В Обращении отмечается, что религиозные деятели должны содействовать формированию общественного мнения по вопросу о необходимости осуществления всеобщего и полного разоружения. «Судьбы человечества под постоянной угрозой ядерного пожарища... В то же время, когда две трети человечества голодает, в мире тратят более 300 миллиардов долларов в год на оружие».

В Обращении к правительствам говорится, что участники Конференции приветствуют «международную разрядку, видя в ней непременное условие для обеспечения мира и справедливости во всем мире» и призывают «все государства к распространению разрядки на все районы мира, к тому, чтобы вслед за политической разрядкой последовала разрядка военная и экономическая, чтобы разрядке был придан необратимый характер». Участники Конференции «с глубоким смирением обращаются к Правительствам с призывом предпринять решительные меры по уменьшению военных бюджетов, сокращению производства и продажи оружия и обеспечению того, чтобы сэкономленные при этом материальные и людские ресурсы были использованы для добра и созидания на благо всего человечества. Война и военные приготовления чужды духовному миропорядку и подрывают моральные устои человека». В Обращении далее указывается, что участники Конференции искренне приветствуют «инициативу созыва Всемирной конференции по разоружению с участием всех государств, больших и малых, ядерных и не имеющих ядерного оружия» при участии неправительственных организаций.

Далее осуждается рост «неоколониалистской системы эксплуатации, поддерживаемой несправедливыми условиями торговли и мировой системой рыночной экономики, укрепляемой военно-промышленным комплексом и межнациональными корпорациями с их огромной и неоправданной властью, которую они используют для воздействия на судьбы народов в интересах монополистического капитала».

Участники Конференции поручили ее рабочему президиуму во главе с Митрополитом Тульским и Белевским Ювеналием (СССР) заботу о широком распространении результатов этого форума и содействии в претворении в жизнь и развитии его идей и решений.

Почетный и рабочий президиум Конференции были приняты в Кремле заместителем Председателя Президиума Верховного Совета СССР С. Б. Ниязбековым и Секретарем Президиума М. П. Георгадзе. Совет по делам религий при Совете Министров СССР дал прием в честь участников Конференции, на котором выступил с приветствием Председатель Совета В. А. Куроедов. Большой прием был дан в честь участников Конференции Патриархом Московским и всея Руси Пименом. Затем была устроена пресс-конференция для советских и иностранных журналистов, на которой члены руководящего комитета Конференции ответили на многие вопросы, связанные с работой Конференции.

Зарубежные религиозные деятели, принимавшие участие в Конференции, имели возможность познакомиться с жизнью церквей и религиозных объединений СССР.

Участники Конференции горячо благодарили Русскую Православную Церковь и другие Церкви и религиозные объединения СССР за братское радушие и гостеприимство, а также выразили единодушную благодарность советскому народу за горячий и дружеский прием.

Протоиерей Евгений МИСЕЮК,
настоятель Минского кафедрального собора.

Мільгаюць абцасікі, віхрам узлятаюць пышныя спадніцы, у захапляючым танцы па сцэне праносяцца пары. Зала замёрла ад захаплення: «Брава! «Харошкі»!

Яны прывабныя сваім юнацтвам, шчырасцю, тэмпераментам, навізной. Тым тонкім густам, пачуццём меры і шчырай любоўю, з якімі даносяць да сённяшняга гледача дыханне старадаўнасці, уводзяць гледача ў свет даўно забытых гадоў. Афіцыйнай датай свайго нараджэння «Харошкі» лічаць лістападаўскія дні семдзесят чацвёртага года, калі на суд гледачоў была прадстаўлена іх першая праграма.

А сёння ў «Харошак» — ужо звыш 400 выступленняў. Танцаў — не пералічыць, і кожны па-свойму непаўторны, арыгінальны. І яшчэ гучыць са сцэны песня, задушэўная, народная, то лірычная, то жартаўлівая. Яе спяваюць салісты Ніна Аўдзеенка і Міхаіл Пацук, гучыць яна ў выкананні вакальнага квартэта «Купалінка». Песня арганічна ўпісалася ў праграму «Харошак», таму што нельга ўявіць без яе народнага гуляння. А кожнае выступленне ансамбля — гэта і ёсць сельскае свята са сваім непаўторным каларытам, з песнямі і танцамі, з дудачкай і лірай, з ражком і цымбаламі.

Заслужанае прызнанне прыйшло да калектыву. «Харошкі» пакарылі сэрцы датчан, ім горача апладзіравалі на Украіне і ў Разані. Сёлета ансамбль будзе ўдзельнікам Усесаюзнага конкурса прафесійных калектываў, прысвечанага 60-годдзю Вялікага Кастрычніка, прадэманструе сваё майстэрства ў Маскве, выступіць у Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы.

НА ЗДЫМКАХ: на сцэне — «Харошкі»; мастацкі кіраўнік ансамбля В. Дудчанка; фрагменты з танцавальнай сюіты «Субота».

Фота Ч. МЕЗІНА.

АДЗНАКА ЗА РОЛЮ

Гэта было крыху недалікатна — урывацца ў іх маленькі акцёрскі калектыў перад самым спектаклем. У невялікай студэнцкай аўдыторыі, прыстасаванай пад «грымёрную», ішлі апошнія рыхтаванні перад выхадам на сцэну. Сёння выпускнікі акцёрскага факультэта павінны былі прадставіць на суд гледачоў і строгай камісіі сваю дыпломную работу — спектакль па п'есе А. Чэхава «Тры сястры».

Высокія, доўгавалосыя дзяўчаты на вачах ператвараліся ў свецкіх дам з гордай паставай і мудрагелістымі прычоскамі, а юнакі, зацягнутыя ў афіцэрскія мундзіры, паважна хадзілі, дэманструючы ваенную выпраўку. Усё ішло сваім парадкам.

— Нясіце пудру, — нечакана патрабаваў мужчынскі голас,— бачыце: вушы як дзве ружы.

— Не хвалюйся, не хвалюйся, — замітусіліся вакол яго аднакурсніцы, — гэта пройдзе, калі выйдзеш на сцэну.

— У мяне, — прызналася адна з «дам», — нават каленкі падгінаюцца ад страху.

Апошні позірк у люстэрка,— ці ўсё ў парадку? Апошняя хвіліна на роздум... Я мысленна благаслаўляю тых, каму сёння давядзецца вытрымаць экзамен на званне прафесійнага акцёра.

...Святло падае на фігуры на цеснай інстытуцкай сцэне, на непатрабавальныя дэкарацыі, зробленыя рукамі саміх студэнтаў. Як атрымаецца спектакль? Увасобіць на сцэне вобразы чэхаўскіх герояў, — гэта задача не з лёгкіх.

— Ці пад сілу яна юнакам і дзяўчатам, якія робяць першыя крокі па шляху да прафесійнага мастацтва? — спытала я ў заслужанага артыста рэспублікі, рэжысёра-пастаноўшчыка спектакля Аўгуста Мілаванава.

— Я доўга думаў, ці варта браць п'есу Чэхава. Яшчэ на другім курсе мы паспрабавалі са студэнтамі паставіць некалькі сцэн. Уважліва назіраў, як яны ўспрымаюць гэты найскладанейшы матэрыял, ці не застаецца ён для іх «тайнай за сямю пячацямі». Бачыў, як пакутвалі мае вучні. Так, пакутвалі ад невырашальных пытанняў, якія ўставалі перад іх героямі: як быць карыснымі і патрэбнымі грамадству людзьмі, як захаваць сваю чалавечую годнасць у барацьбе з мяшчанствам. П'еса кранула за жывое ўвесь курс, і мы вырашылі працягваць работу над спектаклем.

Я быў строгі і няўмольны. З 24 чалавек, якіх набралі на першы курс, засталося менш паловы. Засталіся тыя, хто хацеў і ўмеў працаваць. А гэту якасць я лічу неабходнай для акцёра...

У той вечар спектакль закончыўся позна. Пасля адбылося абмеркаванне «пры зачыненых дзвярах». Прафесіяналы адзначылі зацягнутасць дыялогаў, недастатковую глыбіню раскрыцця філасофскай тэмы п'есы і сур'ёзнасць падыходу студэнтаў акцёрскага факультэта да драматургіі Чэхава. Іншымі словамі — іх пахвалілі за смеласць...

Праз некалькі дзён пасля здачы дыпломнага спектакля я сустрэлася з гэтым курсам. Міжволі ўспамінаю хто ёсць хто: Рая Цыркун, Ірына Сачык, Таццяна Глінская — тры сястры, Ігар Сідорчык—Чэбутыкін, Яўген Крыжаноўскі— Салёны... Зусім юныя твары, крыху больш за дваццаць сённяшнім выпускнікам. Неўзабаве яны раз'едуцца па гарадах рэспублікі, папоўняць прафесійныя акцёрскія калектывы тэатраў і кінастудый. Але чамусьці не такімі ўяўляліся мне заўсёды людзі сцэны — больш эфектнымі і ўражлівымі вонкава. Быццам падслухаўшы мае думкі, нечакана загаварыў Жэня Крыжаноўскі: «Я непрыгожы, можа таму мне і дастаюцца камічныя ролі», — ён развёў рукамі і ўсміхнуўся.

Сапраўды, у дыпломным спектаклі вобраз Салёнага, створаны Жэнем, найбольш удалы. Яго адзнака за ролю — выдатна.

Ён спрабаваў чытаць Межалайціса, апавяданні Маруа, лірыку Пушкіна — не атрымалася.

— Пакуль не атрымалася, — папраўляе Жэня, — але я мару аб Пушкіне. Зараз шукаю сябе ў камічных ролях. Вобраз Салёнага ў «Трох сёстрах» Чэхава, гратэскавы вобраз у «Лісічках» Л. Хэлмана — гэта штрыхі да стварэння вобраза Артура ў брэхтаўскай «Кар'еры Артура Уі».

Я б дадала да гэтага, што Крыжаноўскі прымаў удзел у пастаноўцы п'есы Брэхта разам з А. Мілаванавым. «Ці не аднадумцы вы з рэжысёрам?» — пацікавіўся.

— Нават больш таго, ён мой кумір, — прызнаўся Крыжаноўскі. — Асноўныя ўнутраныя прынцыпы работы я пераняў менавіта ў яго — далікатнасць у адносінах да калег, фанатызм у рабоце і бясконцую веру ў сілу мастацтва тэатра. Зараз я перакананы, што калі хоць адзін глядач пайшоў з тэатра не такім, як увайшоў — стаў больш добрым, сумленным — значыць работа акцёра не была дарэмнай.

Як прайшлі гады вучобы? Пра «акцёраў» гавораць у інстытуце, што яны нават у выхадныя дні не пакідаюць свае аўдыторыі — то чытаюць ролі, то рэпеціруюць, то займаюцца пластыкай, то зноў рэпеціруюць. Гэты невялікі курс аб'ядноўвае ў калектыў любоў да тэатра. У астатнім жа яны розныя, вельмі непадобныя. Ёсць людзі «з прэтэнзіямі», як гавораць тут, «з лянотай», «з ідэалізмам», «педанты». Наўрад ці варта расшыфроўваць гэтыя вызначэнні. Ды і ці важна гэта. Тыя, хто прыйшоў сюды — не выпадковыя людзі, многія з іх працавалі ў тэатрах, наведвалі дзіцячыя студыі і самадзейныя драматычныя калектывы. Людміла Кармуніна, напрыклад, скончыла Мінскае харэаграфічнае вучылішча, працавала ў тэатры музычнай камедыі, Вячаслаў Кузьменка прыйшоў у інстытут пасля сканчэння музычнага вучылішча, а Аляксандр Хвосцікаў вучыўся ў політэхнічным інстытуце. Як бачыце, выбар прафесіі быў усвядомлены, але кожны ішоў да мэты сваім шляхам.

Рая Цыркун, Ігар Сідорчык, Іра Сачык — даўнія знаёмыя. Яны школьнікамі пачалі займацца ў тэатры юнацкай творчасці ў Палацы піянераў. У п'есе Т. Ян «Дзяўчынка і красавік», пастаўленай В. Марозам, Рая вельмі тэмпераментна і натхнёна сыграла галоўную гераіню — Варку. «У Цыркун — рэдкі драматычны тэмперамент», — заўважыў у размове Мілаванаў. Напэўна таму рэжысёр даручыў ёй у чэхаўскай п'есе ролю малодшай сястры — Ірыны.

— Я люблю Чэхава, — гаворыць Рая. — Але адчуваю, што мне не хапае для раскрыцця вобраза Ірыны жыццёвага вопыту, унутранай культуры, якая ўласціва маёй гераіне, не хапае прафесіяналізму. Не дарма мы верылі рэжысёру, калі браліся за п'есу. У рабоце над ёй самі станавіліся больш інтэлігентнымі, прынцыповымі.

Так, авалодаць рамяством акцёра не лёгка і не проста. У гэтым пераканалі чатыры гады вучобы ў інстытуце. Ілюзіі аб святочным і бесклапотным жыцці акцёраў даўно зніклі, засталася толькі ўпэўненасць, што калі і ёсць у табе божая іскра, дык без працы яна патухне.

«Раней мне было страшна ступіць у гэты будынак, — гаворыць Саша Хвосцікаў. — Гэта быў Храм мастацтва, куды непасвечаным нельга ўваходзіць. А потым інстытут стаў майстэрняй, сюды я ішоў кожны дзень, каб працаваць. Тут радаваўся і засмучаўся, знаходзіў сяброў і аднадумцаў».

— Якія ж думкі хвалююць сённяшніх выпускнікоў, аб чым думаюць яны ў дні сваіх дыпломных спектакляў?

— Думаем толькі аб рабоце, марым аб тым, каб трапіць да цікавага рэжысёра, — гэта гавораць зараз усе.

А для некаторых работа пачалася ўжо. Людміла Кармуніна атрымала з Кіеўскай кінастудыі запрашэнне здымацца ў мастацкім фільме. Хутка яна паедзе на пробы. Відавочна, і іншых выпускнікоў Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута «прыкмеціў» уважлівы позірк рэжысёра.

Таццяна АНТОНАВА.

«ЯК БЫЦЦАМ ВЕРНЕШСЯ Ў МАЙ...»

Калі мы гаворым пра беларускую народную творчасць, то часцей за ўсё ўспамінаем Случчыну з яе славутымі паясамі, блізкія кожнаму беларусу радкі Максіма Багдановіча, які апеў талент слуцкіх ткачых:

І тчэ, забыўшыся, рука,
Заміж персідскага узора,
Цвяток радзімы васілька.

Менавіта ўзорнае ткацтва — адна з найбольш яркіх старонак беларускай народнай творчасці. Гэта мастацтва вабіць багаццем арнаментальных кампазіцый і выяўленчых сродкаў, гармоніяй. Яно перажывае ў нашы дні новы росквіт. Яскравым пацвярджэннем такой думкі з'яўляецца творчасць Ганны Паляшчук. Таленавітая мастачка арганізавала вялікую брыгаду жанчын, якія працягваюць традыцыі слуцкага ткацтва.

Нарадзілася і вырасла Ганна Паляшчук на Палессі, у вёсцы Гаўрыльчыцы Старобінскага раёна. Гэты край легенд і песень, дзе і сёння вясковыя жанчыны на свята апранаюць традыцыйнае адзенне, упрыгожанае ўзорным ткацтвам і вышыўкай, паклаў непаўторны адбітак на яе густы і ўяўленні аб прыгажосці. Традыцыі народнай культуры, якія выходзяць з глыбіні стагоддзяў, з'явіліся той жыватворнай крыніцай, якая жывіць яе фантазію.

З ранняга дзяцінства слухала Ганна рытмічны стук кросен, сумную, але заўсёды меладычную, поўную лірычных пачуццяў беларускую народную песню.

Доўга, доўга я ўвечары сяджу,
Тонкі белы кужалёк праду.
Зімку прала,
не спала, не спала,
кросны ткала —
ляшчала, ляшчала.

Бадай, тады зарадзілася ў яе тое выдатнае пачуццё рытму, колеру, кампазіцыі, якое заўсёды характэрна яе вырабам. Умелыя рукі майстрыхі стварал тканіны, што ішлі на адзенне, ручнікі, абрусы. Яны ўражваюць вытанчаным дэкорам, адпаведнасцю тэхнікі выканання ўзору і каляровай гаме.

Асабліва цікавыя льняныя абрусы і ручнікі з узорам «у вакенцы». У аснове іх кампазіцыйнага ладу ляжыць рытмічнае чаргаванне вертыкальных і гарызантальных палос, якія пры злучэнні ўтвараюць формы, падобныя сапраўды на

[Заканчэнне на 8-й стар.]

ХРОНІКА КУЛЬТУРНАГА ЖЫЦЦЯ

НА ТРЭЦІМ Міжнародным конкурсе артыстаў балета ў Маскве паспяхова выступіла маладая беларуская танцоўшчыца Таццяна Яршова. Яна заваявала ганаровае трэцяе месца і дыплом лаўрэата.

СЯРЭБРАНЫМ прызёрам Міжнароднага конкурсу вакалістаў, які праходзіў у Бразіліі, стала салістка Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета БССР Людміла Шамчук.

ХАРАВАЯ капэла настаўнікаў горада Брэста названа лаўрэатам Усесаюзнага фестывалю самадзейнай мастацкай творчасці працоўных.

НАРОДНЫ тэатр маладзечанскага гарадскога Дома культуры закончыў работу над новым спектаклем па п'есе А. Астроўскага «Выхаванка».

У НАВАПОЛАЦКІМ Палацы культуры нафтавікоў адбылося свята кнігі.

САВЕТ Міністраў БССР прысвоіў Верхнядзвінскай раённай бібліятэцы імя вядомага беларускага празаіка Тараса Хадкевіча.

НАРОДНЫ аркестр слуцкага Дома культуры прыняў удзел у злёце - конкурсе духавых аркестраў Літоўскай ССР «Шаўляй-77». Некалькі дзён беларускія музыканты разам з прафесійнымі і самадзейнымі калектывамі Латвіі, Эстоніі, Літвы выступалі ў рабочых клубах, парках, на адкрытых пляцоўках горада.

«ЯК БЫЦЦАМ ВЕРНЕШСЯ Ў МАЙ...»

(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)

вокны сялянскіх хат. Такі просты элемент, як лінія, стварае багатую сістэму геаметрычнага арнаменту ў выглядзе малых і вялікіх квадратаў, клетак у шахматным парадку, прамавугольнікаў. Каларыт будуецца на суадносінах адбеленых і шэрых суровых нітак. Менавіта пры іх злучэнні ўтвараецца той асаблівы серабрысты каларыт, які надае беларускаму арнаменту нацыянальную непаўторнасць і прыгажосць.

Рыхтуючы вясельны пасаг дачцэ, майстрыха тчэ серыю блакітных ручнікоў, упрыгожаных браным арнаментам, на якім адлюстраваны птушкі, кветкі, зорачкі. Звычайна гэта дзве птушкі — перапёлкі, галубы, буслы, сіметрычна размешчаныя па баках кветкі або вазона, закампанаваныя на ўсю шырыню палотнішча. Папярочнымі радамі яны скрозь пакрываюць паверхню, выяўляючы кірунак паласы тканіны, якая бясконца разгортваецца. Стрыманая прыгажосць, урачыстасць узору ручнікоў ствараецца ў асноўным серабрыста-блакітнымі каляровымі спалучэннямі. У час вясельнага абраду такі ручнік выконваў вялікую ролю. Ганна Іванаўна расказвае: «З блакітным ручніком нявеста хадзіла па ваду да калодзежа, каб потым паліць у садзе вішню. Ручнік пры гэтым мацаваўся да канца калодзежнага жураўля і тройчы павінен быў узняцца ў паветра. Абрад суправаджаўся песняй, раздорваннем нявестай абаранкаў і цукерак»

Несумненна, матывы птушак і кветак, блакітны каларыт звязаны з абрадам, які сімвалізуе ўрадлівасць, шчасце, вернасць і непахіснасць шлюбнага саюзу.

У адрозненне ад серабрыстай дымкавасці вясельных ручнікоў, якая дасягнута за кошт натуральных фарбаў ільну, мяккасці пераходу ўзору ў фон, ручнікі для ўпрыгожвання чырвонага кута маюць больш выяўлены рытм, кантраст белага і чырвонага.

Вялікае майстэрства ткачыхі праявілася ў афармленні дываноў, «перабіранак». На звычайных кроснах яна тчэ самыя складаныя кампазіцыі. Яркія, шматколерныя матывы зорак, кветак, вянкоў, лісцяў, вазонаў запаўняюць раўнамерна або з акцэнтам на сярэдзіну чорны прамавугольнік тканіны, зачароўваючы маляўнічасцю і жыццярадаснасцю. Калі ўваходзіш у хату майстрыхі, абвешаную дыванамі, ручнікамі, посцілкамі, дык здаецца, трапляеш на сенажаць, пакрытую рамонкамі, незабудкамі, званочкамі. І пачынаеш разумець, адкуль бярэцца тая пявучасць і пяшчотнасць формаў, ліній, гармонія колераў, што стварае жывы, сакавіты і надзвычай выразны арнамент беларускіх дываноў і ручнікоў.

Аднойчы майстрыху спыталі, чаму яна любіць вывешваць мноства прыгожых тканых вырабаў у хаце. Тая адказала: «Бывала, увойдзеш у дом з моцнага марозу ці дажджу, ды яшчэ пасля цяжкай работы, і здаецца—вярнуўся ў май!» У малюнках арнаменту адбіваецца ўсё яе жыццё, поўнае клопатаў і спадзяванняў.

Звінела камора, звінела,
Дзе наша Ганначка сядзела.
Тонкія абрусы заткала,
Думкамі ўзоры паклала.

Цяпер Г. Паляшчук стварае мноства ўзораў-эталонаў, якія асвойваюцца на Слуцкай фабрыцы мастацкіх вырабаў, распаўсюджваюцца яе калегамі, народнымі майстрыхамі-надомніцамі А. Ліненяй, В. Шыкуць, О. Кіеняй і іншымі.

Традыцыйныя формы і прыёмы ўзорнага ткацтва, якімі карыстаецца Г. Паляшчук, тыповыя для народных ткачых Случчыны. Але ўменне і талент Ганны Іванаўны выяўляюцца ў своеасаблівым бачанні даўно знаёмых элементаў, формаў, якія яна па-новаму супастаўляе, кампануе, што надае ім сучаснае жыццё.

У дасканаласці валодаючы багатымі традыцыямі ўзорнага ткацтва, яна ахвотна перадае іх моладзі. У 1976 годзе Ганне Паляшчук прысвоена ганаровае званне «Народны ўмелец». Лепшыя вырабы ткачыхі пастаянна дэманструюцца на раённых, абласных і рэспубліканскіх выстаўках. Неаднаразова яны былі прадстаўлены ў Маскве на ВДНГ СССР, на аглядах народнай самадзейнасці.

Міхась РАМАНЮК,
кандыдат мастацтвазнаўства.

НА ЗДЫМКАХ: ручнік «у птушкі» і дыван «у кветкі», выткаными майстрыхай; Ганна ПАЛЯШЧУК, народная ткачыха са Случчыны.

Фота аўтара.



ПАХОД... У КАМЕННЫ ВЕК

Гэта было звычайнае для Васіля Рыгоравіча падарожжа ўздоўж Шчары, праз лугі, заросшыя густой травой. Звычайнымі былі і зборы ў дарогу. Рукзак з сапёрнай лапатай, рулеткай і дарожным нажом. Як заўсёды, узяў з сабой фотаапарат, блакнот і аловак.

На гэты раз Васіль Рыгоравіч думаў: ён толькі пройдзе некалькі кіламетраў уверх па рацэ, так сабе, дзеля спартыўнага інтарэсу. Тут ужо добра ўтаптаная ім дарожка — нічога больш не адшукаць.

І нечакана, наблізіўшыся да балоцістай поймы Шчары, заўважыў невялікі пагорачак. Магчыма, і не спыніўся б, калі б не кратавіны. Іх тут было мноства, і, што здалося асабліва дзіўным — дык гэта не само жыллё кратоў, а тое, што яны выносілі з глыбіні нетраў на паверхню. У гэтай глебе было надзвычай шмат прымесяў. Васіль Рыгоравіч паклаў на далонь крыху зямлі і захваляваўся.

...У той дзень ён прыйшоў дахаты вельмі позна і адразу засеў за пісьмовы стол. Ён пісаў у Інстытут гісторыі Акадэміі навук БССР, выказваў свае меркаванні з прычыны таго, што недалёка ад Слоніма, мабыць, размешчана адна са старажытных стаянак першабытнага чалавека. Аб гэтым сведчылі рэшткі матэрыяльнай культуры, вынесеныя на паверхню кратамі.

Праз год Васіль Рыгоравіч узяў дазвол і правёў раскопкі. Услед за ім на разведку культурных пластоў накіраваўся супрацоўнік Інстытута гісторыі АН БССР Міхаіл Чарняўскі. Пашанцавала! Яны знайшлі шмат цікавых рэчаў: крэмневыя нажы, праколкі, скрабкі, посуд каменнай эпохі і рэдкую пасудзіну з закругленым днішчам, характэрную для эпохі бронзы.

Меркаванні Васіля Рыгоравіча поўнасцю пацвердзіліся. На месцы заўважаных ім кратавін была знойдзена стаянка першабытнага чалавека эпохі каменнага веку. З'яўленне гэтай стаянкі вучоныя адносяць да III—IV тысячагоддзяў да нашай эры.

На карце археалагічных помнікаў Беларусі памечана ўжо да дваццаці археалагічных помнікаў, знойдзеных у Слонімскім раёне. Вучоныя справядліва сцвярджаюць, што Слонімшчына — адзін з багацейшых раёнаў рэспублікі, дзе размешчана такая колькасць старажытных культурных пластоў. Заўважым, што большасць гэтых старажытных курганоў і паселішчаў знойдзена Васілём Супруном. На яго знаходкі спасылаюцца ў сваіх работах многія беларускія гісторыкі і археолагі.

Васіль Супрун будаўнік па прафесіі. Працуе прарабам. А як толькі надарыцца вольны час, рыхтуе ў паход рукзак. Інакш ён не ўяўляе свайго жыцця, займаецца археалогіяй з 1963 года, працуе па адкрытых лістах АН БССР, прайшоў сотні кіламетраў, прашурфаваў тоны зямлі ў Гродзенскай і Брэсцкай абласцях.

А нядаўна аматар-археолаг падрыхтаваў да выхаду ў свет брашуру «Археалагічныя помнікі Слонімшчыны».

М. РЫЛКО.

Спорт

У Англіі завершан чэмпіянат Еўропы па стэндавай стральбе, на якім дэбютаваў студэнт Беларускага інстытута фізкультуры майстар спорту Віктар Дзяружкоў. За выступленне ў складзе зборнай маладзёжнай каманды Савецкага Саюза на траншэйным стэндзе ён быў узнагароджаны бронзавым медалём.

***

У Празе завяршыўся адкрыты чэмпіянат Чэхаславакіі па скачках у ваду. Прызёр Алімпійскіх гульняў у Манрэалі мінчанін Уладзімір Алейнік у скачках з вышкі набраў вышэйшы бал і заваяваў залаты медаль.

***

Гомель прыняў удзельнікаў рэспубліканскага фінала II маладзёжных гульняў па лёгкай атлетыцы.

***

У Віцебску адбылося першынство Беларусі па шашках на прыз клуба «Цуда-шашкі» сярод піянерскіх дружын. За званне чэмпіёнаў змагаліся мацнейшыя піянерскія дружыны гарадоў Мінска, Гомеля, Віцебска, Бабруйска і Гродна.

***

У Мінску прайшоў чэмпіянат БССР па аўтамадэльнаму спорту. Першынство аспрэчвалі 35 мацнейшых беларускіх аўтамадэлістаў. Выйграўшы ўсе восем відаў праграмы, у камандным заліку ўпэўнена першынстваваў калектыў Мінскай вобласці.

***

У Палтаве на ўсесаюзным юнацкім першынстве сельскіх спартсменаў па міжнародных шашках залаты медаль заваяваў мінскі студэнт Вадзім Булаш.

***

На Заслаўскім вадасховішчы ля Мінска закончылася першынство горада па віндсерфінгу. У асабістым заліку першым быў Аляксандр Фралоў, перакладчык Інстытута ядзернай энергетыкі АН БССР.

***

У Віцебску прайшоў чэмпіянат рэспублікі па мотакросу. Званне пераможцаў у чатырох класах машын аспрэчвалі 82 спартсмены з усіх абласцей і горада Мінска. У камандным заліку перамаглі прадстаўнікі Мінскай вобласці.

***

У Мінску адбыўся міжнародны таварыскі матч па гандболу, у якім сустрэліся зборныя каманды Беларусі і Эфіопіі. Матч завяршыўся перамогай гаспадароў поля.

***

У сталіцы рэспублікі пачалося ўсесаюзнае першынство па стральбе з лука, у якім удзельнічаюць каманды сельскагаспадарчых вышэйшых навучальных устаноў.

«САВЕЦКАЕ ПАЛЕССЕ»

Першая выстаўка калекцыянераў Палескага краю адбылася ў горадзе Чарнігаве. Яна прысвечана 60-годдзю Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. У ёй прымалі ўдзел 42 калекцыянеры з 11 абласцей трох братніх рэспублік — Расійскай Федэрацыі, Украіны і Беларусі.

Калекцыі, прадстаўленыя на выстаўцы філатэлістамі Мінска, Брэста, Гомеля і Магілёва, адлюстроўвалі дасягненні нашай рэспублікі ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы, навуцы, культуры. Гераічнаму мінуламу БССР прысвечана калекцыя «Старонкі гісторыі Беларусі», яе флоры і фауне — «Птушкі Беларусі» і «Запаведнікі на Прыпяці».

Многія з нашых калекцый адзначаны медалямі і прызамі.

ВАН ГОГ У ПІНСКУ

Шматлюдна ў гэтыя дні ў залах Пінскай карціннай галерэі. Тут адкрыта выстаўка французскага жывапісу. У экспазіцыі 50 копій-рэпрадукцый, выкананых у парыжскай майстэрні Надзеі Лежэ і падараваных ёю Дзяржаўнаму мастацкаму музею БССР.

На выстаўцы шырока прадстаўлены карціны Курбэ, Ван Гога, Рэнуара, Пікасо, Гагена, Каро і другіх выдатных мастакоў Францыі.

Гумар

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

НАШ АДРАС:

МІНСК-ГСП, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 44.
ТЭЛЕФОНЫ: 33-07-82, 33-02-80, 33-03-15, 33-01-97.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Зак. 1139